

*Мікола Лук’янюк*

# *З нарваўскага боку*

*Праграмная рада тыднёвіка „Ніва”*
*Беласток 2007*

**Рэдактар**
*Міра Лукша*

**Карэктура**
*Яўгенія Палоцкая*

**Тэхнічная рэдакцыя**
*Адам Паўлоўскі*

Zrealizowano dzięki dotacji
Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji

**ISBN 978-83-925904-0-8**

Copyright © 2007 by Rada Programowa Tygodnika „Niwa”

**Друкарня**
„Offset-Print”, ul. Broniewskiego 14, Białystok

# Мікола Лук’янюк, гаспадар

Мікола Лук’янюк з Бялкоў Нарваўскай гміны, Гайнаўскага павета вядомы чытачам тыднёвіка беларусаў у Польшчы ад самага пачатку існавання „Нівы” — ад 1956 года. Апынуўся ён сярод першых і найбольш верных карэспандэнтаў, якія слалі ў рэдакцыю допісы з вёсак і мястэчак Беласточчыны і ўсяе краіны, дзяліліся сваімі роздумамі, цешыліся новым і добрым, хвалілі людзей вартых пашаны за іх сумленную працу і важкія думкі, ганьбавалі адмоўныя з’явы і благіх людзей — дармаедаў, дурняў, зваднікаў, бесталковых чыноўнікаў, здраднікаў роднага. Не адмаўляліся яны ўзяць голас і ў глабальных, сусветных справах. Мікалай Лук’янюк часцей за ўсё свае развагі складваў у вершы. На працягу больш за паўстагоддзя пракаментаваў ён па-свойму розныя з’явы, якія craналі тутэйшы люд, у сотнях вершаў — публіцыстычных, сатырычных, лірычных. Свет ён бачыў як добры, дбайны гаспадар, і як кожны паэт — хацеў дакласці сваё слова да таго, каб гэты свет — гожы ды недасканалы — паправіць. Захоплены цудоўнай прыродай малой айчыны ў кругавароце пораў года, чыстымі чалавечнымі пачуццямі добрых людзей, у пале палеміста і шукальніка праўды, гаспадара не толькі на сваім палетку, дажыў дзядзька Мікола да веку прадзеда ў сваіх Бялках. І ўсё шыкуе сваю хату для таго, каб паслухаліся беларусы з розных бакоў і сабраліся гуртам за ягоным круглым сталом пад яблыняй, далі добрую раду адзін аднаму і ўсім разам. Каб паправіць свой беларускі свет. І каб любая ўлада паслухала, што хоча сказаць са свайго нарваўскага староння гаспадар, які перажыў не адно панаванне.

Наш маленькі выбар твораў Міколы Лук’янюка хай будзе падзякай яму за ягонае стараннe і шчырае ўзгадоўванне роднага на нашай беларускай ніве.

**Міра Лукша**



# *МАЕ ДУМКІ, МАЯ ВЕРА*



# Да беларусаў!

*Дарагія браты-беларусы:*
*Нам трэба тое знаці,*
*Што нашу родную „Ніву”*
*Кожны тыдзень трэба*
*чытаці!*

*Не толькі раз у год,*
*Каб каляндар набыць,*
*Каб ведаць калі святы*
*І ў царкву схадзіць!*

*Бо ў нашай „Ніве”*
*Навіны ёсць пра нас,*
*Ды добрая старонка*
*Для дзетак у школьны час.*

*Бо „Ніва” праўду піша,*
*Дае добрыя парады,*
*Хто яе прачытае,*
*Напэўна будзе рады!*

*Часта з нашай „Нівай”*
*Нам трэба сустракацца!*
*Сваёй роднае мовы*
*Ніколі не зракацца!*

*І праваслаўнай верай*
*Трэба нам ганарыцца,*
*І дзе хто пасяліўся,*
*Пра веру не забыцца!*

# *Крэда*

*Казала мне мая мама:*
*— Знай, сынок, як жыць.*
*Кепска не рабі нікому*
*І шчасце твары. —*
*Словы маці я выконваў,*
*Заўжды так стараўся,*
*Каб кожным жыццём*
*Кожны радаваўся.*
*Было шчасце на душы,*
*Сэрца весялілася,*
*Калі кожная сям'я*
*Жыццём радавалася.*
*Гэта я перажываў,*
*З імі весяліўся,*
*Шчыра кожнага дня*
*Я Богу маліўся.*
*Дзякуй Табе, Божа,*
*За шчодрую ласку,*
*За жыццё шчаслівае*
*Шлю Табе падзяку.*
*Буду я маліцца,*
*Каб шчасця дачдаць*
*І з Табою, Божа,*
*Радасць пражываць.*

# Мая вера

*Чаму так жывецца,*
*Хто мне растлумачыць,*
*Што адзін другому*
*Прывык нагу падстаўляці.*
*Калі не тае веры,*
*Каб на яго халера,*
*Чым на яго дзівіцца,*
*То лепей на звера.*
*Што ж я вінаваты,*
*Як такім радзіўся,*
*Быў тады маленькі,*
*Як у царкве хрысціўся.*
*Калі ўжо ахрысцілі,*
*Трэба ўсім знаці,*
*Што я сваю веру,*
*Да канца буду шанаваці.*
*Захоўваць яе буду*
*Ды за яе змагацца,*
*Каб нашаю верай*
*Кожны мог радавацца.*
*Каб сваёю верай*
*У нас кожны ганарыўся,*
*Дзе ён не паедзе,*
*Веры не сараміўся.*
*За нашую веру*
*Многія пакутавалі*
*І вечны адпачынак*
*Яны ў небе дасталі.*
*Бо нашую веру*
*Усім трэба шанаваці*
*І дзецям да сэрца*
*Яе прывіваці.*

# Беларусь

*О, беларускі мой народ,*
*Ты зняволены чужынай.*
*Якая ў цябе сіла ёсць,*
*А колькі ў цябе волі.*

*Айчыны нашае няма,*
*Ёю чужыя ўладаюць*
*І нам свабоды не даюць,*
*Заўжды нас прыгнятаюць.*

*Чужымі нас яны завуць*
*І нас не паважаюць,*
*Кажуць на ўсход нам уцякаць:*
*Туды нас выганяюць!*

*А тут мой родненькі куток,*
*Прадзед мой тут радзіўся,*
*За гэту зямлю ваяваў,*
*З захопнікам змагаўся.*

*Тут бацька мой жыццё правёў,*
*Тут мы ўсе выраcталі,*
*Культуру сваю і звычай*
*З вякоў мы ўтваралі.*

*А колькі згінула людзей,*
*Аддалі што дарагое,*
*Каб у дастатку мы жылі,*
*Не знaлі кепскіх мараў.*

*Далей змагацца буду я*
*За край, зямлю, культуру*
*І сваіх унукаў навучаць*
*Шанаваць нашу дзяржаву!*



# Думаў

*Думаў: перастану*
*Я ў „Ніву” пісаць,*
*Але цяжка будзе*
*Мне ўсё стрываць.*
*З „Нівай” я звязаўся*
*— Ужо пяцідзесяцігоддзе.*
*Я хачу, каб добра*
*Ў нас жылі ўсе ў згодзе.*
*Каб бяды не зналі,*
*Усе шчасця дачакалі*
*Ды каб нашу „Ніву”*
*Ўсе людзі чыталі.*
*Трэба нашу „Ніву”*
*Ўсім нам шанаваць,*
*Каб яна знайшлася*
*У нашай кожнай хаце.*
*Каб з нашаю „Нівай”*
*Добра было жыць,*
*Трэба нашу „Ніву”*
*Нашым усім любіць!*

# *Дзеткі*

*Ой вы, мае дзеткі,*
*Што далей рабіць?*
*Цяжкавата ўжо мне*
*Па свеце хадзіць.*
*Каб зямлю дагледзець,*
*Пасеяць ды ўбраць,*
*Трэба мець здароўе*
*З усім тым ваяваць.*
*Даволі дом падмесці*
*Ды ў двары прыбраць,*
*Затым сесці на лаўку*
*І ўнукаў чакаць.*
*А, калі ўжо з’явяцца,*
*Падарак трэ даць,*
*Можа, тады будуць*
*Часцей прыязджаць,*
*Каб дзеда наведаць*
*Ды сваю бабулю,*
*Спрабаваць каўбаскі,*
*Ўзяць моркву, цыбулю...*
*Вялікі вам дзякуй,*
*Што хоць не забылі*
*Наведаць тую хатку,*
*Дзе вас ахрысцілі,*
*Пабываць пад дахам,*
*Дзе вас гадавалі,*
*Дзе бабулька з дзедам*
*Бай-люлі спявалі.*

# *Адзін*

*Калі адзін астанешся*
*Ў сваёй роднай хаце,*
*Да каго азвешся?*
*Каму што сказаці?*
*Сядзеш пад аконцам,*
*На свет падзівіцца.*
*Грэешся на сонцы,*
*А ў сэрцы журыцца.*
*Так сядзіш у цішы,*
*Над усім разважаеш,*
*Ці ты ўжо нажыўся,*
*Што шчасця не маеш?*
*Так плывуць мінуты,*
*Аж сам скалыхнешся.*
*Ці крышку здрамнуў ты,*
*Ці табе здаецца?*
*Сумуеш з тугою,*
*Над сваёю доляй,*
*Каб не быць ніколі*
*Круглым сіратою.*
*Дзеці разышліся*
*Па ўсёй дзяржаве.*
*У іх свае сем'і*
*І свой клопат маюць.*
*Хай жывуць шчасліва,*
*Таго ім жадаю,*
*Ды не забываюць*
*Маю хату скраю.*
*Словам абмяніцца,*
*Пра клопат сказаць,*
*Як там ім жывецца,*
*Ліст каб напісаці...*
*Вельмі таго просяць*
*Вашы бацька й маці.*

# *Не забылі*

*Цяжка мне забыці,*
*Што калісь бывала,*
*Як людзей нявінных*
*„Войска” забівала.*
*Дзе іхны магілы?*
*Не зможам адшукаці,*
*Каб ім пахаванне*
*Хрысціянскае даці.*
*Тых, што забівалі*
*Нельга запытаці;*
*Яны цяпер ветэраны,*
*Усім трэба знаці.*
*Сядзеў такі ў лесе,*
*Грабяжом займаўся,*
*Цягнуў да сябе ўсё*
*І багатым стаўся.*
*Цяпер стаў героем,*
*Бо тады змагаўся.*
*Для мяне зладзюгай*
*Навекі астаўся.*
*Ад такіх зладзюгаў*
*Сцеражы нас, Божа!*
*Гэтага прашу я —*
*Можа дапаможаш.*
*За болі пякучы*
*Трэба даруваці.*
*Толькі дзе магілу*
*Брата адшукаці?*
*Дзе ён спачывае,*
*Каб я мог дазнацца,*
*Крыжык там паставіць,*
*Штогод пакланяцца.*

# *Беларусы*

*Беларусы, беларусы,*
*Праваслаўныя сыны,*
*Што вы дрэннага зрабілі?*
*Да чаго край давялі?*

*Лукашэнка вамі правіць,*
*Хоць з тыранаў ён тыран,*
*Усё беларускае знішчае,*
*Сталінскі закон трымае.*

*Прабудзіцеся са сну,*
*З лукашэнкаўскай нядолі,*
*У свае рукі вазьміце*
*Лёс свой сваёй воляй.*

*Каб народ шчаслівы быў —*
*Трэба ўсім з'яднацца*
*І рэжыму Лукашэнкі*
*Ніяк не паддавацца.*

*Дзе Кастусь наш Каліноўскі?*
*Дзе магутна сіла,*
*Што калісь была ў народзе,*
*Моцай паланіла?*

*З поўначы, заходу, поўдня*
*Усе вас падтрымаюць,*
*Дабрабыту ды здароўя,*
*Усім вам жадаюць.*

*Ці Картуз-Бярозу*
*Хочуць вам стварыць,*
*За свабоду змагароў*
*Усіх туды ўсадзіць?*

*Не дамося мы, таму*
*Трэба нам з'яднацца.*
*За свабодную краіну*
*Дружна пазмагацца.*



# *БАЛІЦЬ СЭРЦА*



# „Земляроб”

*Як жа ў Беластоку*
*Яму земляробам звацца,*
*Калі будуць людзі*
*З яго ўсе смяяцца?*
*Ён жа там дырэктар,*
*Добру ўладу мае,*
*А бацька старэнькі*
*Зямлю ўсю абрабляе.*
*А калі не будзе*
*Яму добрай працы,*
*Тады ён „куранёўку”*
*Сам будзе даставаці.*
*Пра сваю зямельку*
*Нідзе сам не скажа,*
*Бо вялікі сорам*
*Яму рукі звяжа.*
*У вёску прыедзе,*
*Каб наведаць бацьку,*
*Як свінку той зарэжа —*
*Каб узяць каўбаску.*
*Сам машынай ездзіць,*
*Нат шафёра мае,*
*Кожны год улетку*
*Ў цёплы край з’язджае.*
*Чаму КРУС такі бедны,*
*Праўду трэба знаці:*
*З гарадскіх „земляробяў”*
*Няма як грош сцягаці!*



# Куранёўка

*Куранёўку сын дастаў,*
*Вельмі ж ганарыўся,*
*Пачаў хадзіць у карчму*
*Ды п’яніцам зрабіўся.*
*І хоць ужо не дастае*
*Такой дапамогі,*
*З дому цягне кожны грош*
*І п’е да знямогі.*
*Правядзе ля карчмы дзень,*
*Потым ідзе дахаты,*
*Маці родную ганяе,*
*Каб грошай узяці.*
*Сын штодзень ідзе ў карчму,*
*Праклінае матка:*
*„Распіла ты,* куранёўка,
*Роднае дзіцятка!”*



# Як далей...

*Як далей нам жыці
Ды за што ўзяцца,
Калі кожны на вярхушку
Пачынае пхацца?
Былі мы вам патрэбны,
Як вас выбіралі.
Залатыя горы
Вы нам абяцалі.
Калі на верх узлез,
То пра ўсё забыўся.
Хіба розум у галаве
Яму перакруціўся.
Забыўся ты пра сялян,
Прызабыў аб рабочых,
Сабе дыету падняў,
Бо грошы харошы.
Зноўку будзем выбіраць,
Станем прыглядацца,
Каб халерным галадранцам
Ужо больш не паддацца!*



# Ігнатка

*Быў Ігнатка-гаспадар,*
*Шчыра так стараўся,*
*Гаспадарку даглядаў,*
*Нікому не здаваўся.*
*А цяпер ён пастарэў,*
*Не зможа рабіці,*
*Трыста злотаў ён дастаў:*
*З таго мусіць жыці.*
*Трэба грошы так дзяліць*
*Ды кругом разглядацца,*
*Каб і хлеба сабе купіць,*
*І кашанкай падмацавацца.*
*Неяк там Ігнат жыве,*
*Свой век дажывае,*
*І нашых дэмакратаў*
*Моцна праклінае.*



# Трэба дзякаваць

Ой вы, хвоі ды сосны,
Чалавечыя сёстры,
Пах жывіцы
Да сэрца плыве.
Летам выйдзеш да лесу
Адпачыць на хвіліну,
Льецца радасць у сэрца
Пах жывіцы — у душу.
Станеш сам у цянёчку
На хвіліначку трошкі
Абапрэшся ў бярозавы пень.
Засумуеш хвіліну,
Успомніш родную ніву
Як калісь зямлю плугам араў
Ды ліповыя лапці
Як сплятаў ты вясною
І на ногі сабе абуваў.
А цяпер, малаверкі,
Трэба дзякаваць Герку,
Што жыццё залатое
Ён для нас учыніў.
І зайсці ў Храм Божы,
Закупіці абедню,
Каб святар памаліўся
Аб ім.

# На вёсцы

*Я жыву на вёсцы,*
*Мая хата з краю,*
*Што дзеецца на свеце,*
*Аб тым мала знаю.*

*Што ў нашай гміне? —*
*Цяжка мне сказаці:*
*Не магу даехаць,*
*Каб там распытаці.*

*Так дзянькі праходзяць,*
*Гады пралятаюць,*
*А мае аднавяскоўцы*
*Пэкаэса чакаюць.*

*Былі яны ў маршалка,*
*Многа разоў у гміне,*
*Не могуць сцярпеці,*
*Што нам крыўду зрабілі.*

*Нашы самаўрадаўцы*
*Аб тым мала дбаюць,*
*Што людзі ў горад*
*Даехаць на чым не маюць!*

*А каб па здароўе*
*Як-небудзь дабрацца,*
*Клікаць трэба таксі,*
*Каб да лекара дастацца.*

*Улад не цікавіць,*
*Як людзі пражываюць,*
*Бо яны мяккія крэслы*
*І добрыя пасады маюць!*

# Не спадзяваўся

*Я таго не спадзяваўся,*
*Што суседка скажа:*
*Што суседачкі мужык*
*Ды кумы ўсё ходзіць.*

*Кума яго даглядае*
*Ды чарачку паставіць,*
*А суседачкі мужык*
*Яе па попе гладзіць.*

*Кума ходзіць ды смяецца,*
*Што ёй так усё ўдаецца,*
*Ды жыве яна як у раю,*
*Бо так кум ёй дагаджае.*

*Кум з кумою вельмі зжыўся,*
*Часта там начуе,*
*Ездзяць разам на кірмаш,*
*А потым балююць.*

*А суседка так злуецца,*
*Ды ўсіх праклінае,*
*Што яе ніхто з суседзяў*
*Нат не пашкадуе.*

# Уладзіміру

Не тужы, Валодзя,
Якось будзеш жыці,
Хоць можа ты з войтам
Ужо не будзеш гаварыці.

Калі мы ўжо станем
Гміну крытыкаваці
Знай, што будзе кепска
Нам справы афармляці.

Як зойдзем мы ў гміну
Па справах адносных,
Дык на нас усе глянуць
Напыхліва, злосна.

А калі ўжо станем
Свае справы „залатвяці”,
То гмінныя бюракраты
Будуць нас абмінаці.

Яшчэ пагрозяць пальцам,
Каб нас дакарыці,
Ну і перастануць
Зусім нас любіці!

# *Самаўрад*

*Радным гміны добра знаці*
*Як дыеты павышаці,*
*А за дыетамі — работа,*
*Каб ніхто не меў клапотаў.*
*Трэба добра ўсё рабіці*
*Ды сваім людзям служыці —*
*Яны ўсіх вас выбіралі,*
*Каб жыццё ім папраўлялі.*
*Дбайце вы пра цэлу гміну:*
*Пра Маньку, Гапку ды Кіліну,*
*Гляньце як людзі пражываюць:*
*Даехаць у горад клопат маюць —*
*Ні да лекара, ні ў гміну.*
*Так на канікулах зрабілі.*
*Пэкаэса нам забралі,*
*Сядзець у хаце загадалі,*
*А калі маеш трывогу:*
*Кліч хуткую дапамогу.*
*Там дыспетчар адазвецца*
*Добра раіць ёй, здаецца:*
*Ты вазьмі кіёчак у руку,*
*Зрабі невяліку прагулку,*
*Дзесяць кіламетраў, знаю:*
*Будзеш жыці як у раю,*
*Выжанеш усе хваробы,*
*На здароўе, даспадобы.*
*Знаюць райцы, як жывецца,*
*Што бяда ў вёскі пхнецца!*
*Ім не хочацца задбаці,*
*Каб тую бяду прагнаці.*
*Пра сябе яны ўсё дбаюць,*
*Сход зрабіць часу не маюць,*
*Каб з людзьмі пагаварыці,*
*Што патрэбнае зрабіці.*
*Такіх райцаў з гміны гнаці!*
*Трэба новых выбіраці,*
*Новыя лепей будуць знаці,*
*Як парадак дзе трымаці.*

# Усходняя сцяна

*Часта я пісаў у „Ніве”*
*Пра Усходнюю сцяну:*
*Як тут вёскі адміраюць*
*І як людзі ў іх жывуць.*

*Крамы тут ліквідаваны,*
*Што пры камуне расцвілі.*
*Чыгункі ўсе пазакрывалі,*
*Пэкаэсы — аднялі.*

*А прыедзе крама ў вёску,*
*Прывязе ліхі тавар,*
*Прадавец здзірае грошы,*
*А ты, хлопе, мусіш браць.*

*Калі ты не купіш у краме*
*Ніц не ўложыш у гаршчок*
*І аб гэтым добра знаеш —*
*Што не паедзеш у гарадок.*

*У гарадах лепей жывецца,*
*Там тэатр, крамы, кіно,*
*Кожны ў горад з вёскі пхнецца,*
*Бо там — лягчэйшае жыццё.*

*Калі нашы самаўрады*
*Пра людзей так будуць дбаць,*
*Хутка на Сцяне ўсходняй*
*Будуць малпаў гадаваць.*

*Пра нішто яны не дбаюць,*
*Каб лягчэй жылося нам.*
*Сабе кішэні „набіваюць” —*
*Трэба нам аб гэтым знаць.*

*Не прыедзе ўлада ў вёску,*
*Каб пабачыць чым жыве,*
*Склікаць сход, пагаварыці,*
*Што патрэбна для яе.*

*Крэслы ім так дарагія —*
*На ім мяккенька сядзець.*
*А што робіцца за гмінай —*
*Ім не хочацца глядзець!*

# Жніво

*Бывала, калісьці,*
*Сярпом жыта жалі,*
*Сваё закончыўшы,*
*Суседу дапамагалі.*

*Потым былі дажынкі:*
*Пап’юць ды паспяваюць*
*І халоднай вадою*
*Усіх паабліваюць!*

*Хоць сусед з суседам*
*З-за мяжы сварыўся,*
*Памагчы калі трэба —*
*Пра ўсё забыўся.*

*Вёска жыла ў згодзе*
*І людзі дружылі,*
*У бядзе і ў горы*
*Іншых не забылі.*

*А цяпер: пагляньце,*
*Як вёска пражывае,*
*І адзін другому*
*Ніц не спагадае.*

*Нават родныя дзеткі*
*Пра бацькоў не дбаюць,*
*У дом састарэлых*
*Жыці пасылаюць.*

*Цяпер гэтак сумна*
*Стала ў вёсцы жыці,*
*Суседу з суседам*
*Не хочацца гаварыці...*

# Кепская нявестка

„Пайду, бацька, я ў поле,
Недалёка за бронкай
Там чакае ўжо мяне
Мая дзяўчына Бронка.

А калі ўжо ажанюся,
Буду Броняй зваці,
Яна будзе шанаваць Вас,
бацька і маці".

А калі сын ажаніўся
Ды стаў Броняй зваці,
Дык стала наводзіць
Парадкі ў хаце.

Цяпер сын ціха сядзіць
І голасу не мае,
Толькі Броня ўсё фурчыць
Ды ўсіх праклінае.

„Свёкар, ціха ты сядзі!
Ты маўчы, старая!
Я па-свойму тут раблю,
У руках усё маю!"

І сынок цяпер маўчыць,
Не можа ніц сказаці:
Стала Броня гаспадыняй
У цалюткай хаце.

Калі такую нявестку
Меці ў сваёй хаце,
Лепей у маладых гадах
Бацькам паміраці.



# Суседка

*Суседка з суседкай*
*Пры людзях гамоняць,*
*Адна з іх адвернецца,*
*Другая ёй „прылімоніць”.*
*Як яна стане*
*Языком хвастаці —*
*Зачыняй вокны і дзверы*
*Ды сядзі ціха ў хаце.*
*Так усіх абгаворыць,*
*Абсудзіць, аблае...*
*А ўсім здаецца,*
*Што яна святая.*
*У царкву штонядзельку*
*Стала яна хадзіці,*
*Там усіх аглядае,*
*Каб потым абсудзіці.*
*Вось тую суседку*
*Усе добра знаюць*
*І калі дзе спаткаюць,*
*То здалёк абмінаюць.*
*Такую суседку*
*Не дай Божа меці,*
*Бо ўпусціш у хату,*
*Вынясе ўсё „смецце”.*

# *Турботы*

*І турботы, і хваляванне —*
*Ёсць у сямейцы баляванне:*
*Дачку замуж выдаваць,*
*Гасцей зусюль пасклікаць.*

*Грыша, Міша ды Раман,*
*Прыходзьце да нас у госці,*
*Тут гарэлкі мы пап'ём,*
*Будуць бацькі хросны.*

*Замуж Ганну аддаем,*
*Хай будзе шчаслівa,*
*Жаніхом дык будзе Ваня,*
*Жыць будуць яны міла.*

*На вяселлі ўсе гулялі*
*З пятніцы да ранку —*
*Так калісь ім зваражыла*
*Чорная цыганка.*

*Як закончылі вяселле,*
*Усе госці ад'язджалі,*
*Ганна з Ванем на развітанне*
*Усіх цалавалі.*

*Як раз'ехаліся госці,*
*Стала ціха ў хаце,*
*Ваня з Ганнай пачалі*
*У жмуркі гуляці.*

*Не прайшоў задоўгі час —*
*Бегай як у прыску:*
*Трэба Ванечку зараз*
*Рыхтаваць калыску.*

*За калыскай — зноў бяда:*
*Як спакойна спаці,*
*Трэба ж жонцы памагчы*
*Дзіцятка даглядаці!*

*Ты дзіцятка калышы,*
*Памяняй пялюшку...*
*Бо Ганульцы маладой*
*Забалелі ручкі.*

# *Парада на доўгае жыццё*

*Хочаш жыці за сто лет,*
*Пар ды пі ты ліпаў цвет.*
*Хочаш мець многа вітамінаў,*
*То пі параны маліны.*

*Не шкадуй сабе і соку,*
*То не будуць балець бокі.*
*Збірай ягады брушніцы*
*І суніцы, і чарніцы*

*Ды кампотаў нагатуй*
*Ці варэння нарыхтуй,*
*Спажывай ты іх зімою,*
*Дык хварэць не будзеш болей.*

*Збірай зёлкі на гарбату*
*Пар ды пі яе ў ахвоту.*
*А калі злапае грып,*
*Пад пярыну хутчэй смык!*

*Як сагрэеш свае косці,*
*Грып уцякаць будзе са злосцю.*
*Тады знай дружочак-браце,*
*Весялей будзе ў хаце!*

*Не трэба штучных вітамінаў*
*Піўшы параны маліны.*
*Будзеш здаровы і бадзёры,*
*Зёлкі пражануць усе хворы.*

*Так без ніякіх хімікатаў*
*Будзь здаровы ды багаты!*

# Навагоднія пажаданні

*Пажаданні ў Новым годзе
Усім палітыкам я шлю.
Калі ўзлезлі на вярхушку,
Шануйце нашу зямлю.*

*Тым, што скуру памянялі
Хачу праўду падказаць.
Не ўмелі правіць дзяржавай,
Цяпер трэба памаўчаць.*

*Каб лепей усім жылося,
Цяпер мусім пацярпець,
Дзірку ў бюджэце залатаць.
Плаціць будзем мы ўсе.*

*Мусім гэта пратрываць,
Вашы гульні адчакаць.
Тады будзем лепей жыць —
Кожны ўмее абяцаць.*

*Каб добра ўсім жылося,
Таго ў Госпада папросім.
Каб усе былі шчаслівы —
Памажы нам, Божа мілы.*

*Хоць і мая хата з краю,
Буду жыці як у раю,
Есці мяса ды пірог,
Абы толькі жывот змог!*

# *Шлюбныя пажаданні*

*Пляменніцы з Гарадоцкай гміны,*
*якая стане пад вянец*
*30 верасня 2006 г.*

*Я ўжо старэнькі,*
*Сілы мала маю.*
*Многа, многа шчасця*
*Табе я жадаю.*

*На ручнічку станеш,*
*Будзеш прысягаці*
*Мужу свайму вернасць,*
*Усё жыццё аддаці.*

*Не забудзь пра бацьку,*
*Дзе ён прабывае,*
*Што зямелька-маці*
*Яго пухам прыкрывае.*

*Ды скажы ты тату:*
*Хоць веру мяняю,*
*Роднага, сваёга*
*Не пазабываю.*

*Хоць буду далёка,*
*Рэдка буду ў хаце,*
*Усё ж буду дадому*
*К табе прыязджаці.*

*Буду прыязджаці*
*І зімой, і ўлетку,*
*На тваю магілку*
*Са свечкай і кветкай.*

*І сваю сямейку*
*Буду даглядаці*
*Ды маліцца Богу*
*Дзетак навучаці,*

*І каб мае дзеткі*
*Не забылі дзеда*
*Трэба час ад часу*
*Магілу наведаць.*



# Унукам

*Унукі мае, унукі,*
*Ўсіх я вас кахаю,*
*Шчасця ды здароўя*
*Я для вас жадаю.*
*Куды б хто не паехаў,*
*Дзе б не пасяліўся,*
*Кожнаму трэба помніць,*
*Што тут нарадзіўся.*
*Над ракою Нарвай,*
*Каля Лядскай пушчы,*
*А можа ў славутай*
*Белавежскай гушчы.*
*Вучыцеся добра,*
*Ідзіце ведаў следам,*
*Таго вам жадаюць*
*Вашы баба з дзедам.*
*Кланяйцеся нізка*
*Сваім бацьку й матцы*
*І не забывайце*
*Дзедавае хаткі.*

# *Залаты юбілей*

*З нагоды юбілею*
*Шчасця я ўсім жадаю,*
*Тым, што „Ніву” ўтваралі,*
*Каб добрае здароўе мелі.*
*А цяперашнім рэдактарам „Нівы”,*
*Каб усе жылі шчасліва*
*Моцнае здароўе мелі*
*І ніколі не хварэлі.*
*А за тых, што адышлі*
*У вечную дарогу,*
*Трэба памаліцца*
*Ды прасіць у Бога,*
*Каб у зямельцы-маці*
*Было ім лёгка*
*Як у пуху ляжаці.*
*А дзеткам, што пішуць*
*У родную „Зорку”*
*Каб у школе вы мелі*
*Не адну шасцёрку.*
*Лідэрам беларускім,*
*Каб паядналіся,*
*Ды адзін з другім*
*Ніколі не спрачаліся.*
*Запрашаю я вас*
*У нейтральную хату,*
*Каб жылі шчасліва*
*Вы ўсе дый багата.*
*Вось за гэта, братцы,*
*Вас буду выхваляць*
*Цябе, Яўген Чыквін,*
*Прашу ўсіх паяднаць.*
*Я буду маліцца*
*Магутнаму Богу,*
*Каб навёў усіх нас*
*На добрую дарогу.*

# *Нарадзіла*

*Нарадзіла маці дзетак,*
*Шчыра даглядала,*
*Столькі начэй не даспала,*
*Як іх калыхала.*

*Дзеткі сталі падрастаці*
*І пайшлі ў школу,*
*Новенькія сшыткі, кніжкі*
*Ім бацькі куплялі.*

*Як закончылі навуку,*
*Сталі працаваці,*
*А старэнькія бацькі*
*Кватэры ім купляці.*

*За кватэрай — самаход,*
*Каб была выгода.*
*Няхай усе суседзі знаюць,*
*Што з лепшага роду.*

*А калі абсталявалі*
*Дзецям усе выгоды,*
*Бацькам сілы не хапіла —*
*Не хапіла згоды.*

*Цяпер дзеткі не шануюць*
*Ні бацькі, ні маці,*
*У дом састарэлых*
*Хочуць іх аддаці:*

*Няхай там чужыя рукі*
*Бацькоў даглядаюць,*
*Бо яны ўжо цяпер*
*Грошай ім не маюць.*

*Вось як дзетачкі цяпер*
*Пра бацькоў не дбаюць,*
*Што бацькі для іх зрабілі,*
*Аб тым забываюць!*

# *Кожны пхнецца*

*Кожны з вёскі ў горад пхнецца,*
*Яму добра так здаецца,*
*Бацьку й маці пакідае,*
*Лягчэй жыці ён жадае.*

*Бацькі зямлю абрабляюць,*
*Круцяцца, як толькі знаюць,*
*Як ім, дзеткам, дагадзіці:*
*Можа, будуць лепей жыці?*

*А калі свінчо заколюць,*
*Дзеці маюць тады волю:*
*На машыне ў вёску пруцца,*
*За „пальцам пхануюˮ бяруцца!*

*Каб на працы ўсім сказаці:*
*Добрыя ў нас бацька й маці,*
*Вось як дзеткам дагаджаюць,*
*Пра сябе яны не дбаюць.*

*Досыць хлеба ім, кашанкі,*
*Штось дакупяць яшчэ ў Манькі,*
*Бо яна там краму мае:*
*Тавар з горада сцягае!*

# *Рута*

*Рута, наша Рута:*
*Рута зеляная*
*Я табе жадаю,*
*Пражывай як у раі.*
*Ты сваю сямейку*
*Добра даглядаеш,*
*Пра сваіх унукаў*
*Ты не забываеш.*
*Пражывай у здароўі,*
*І ў вялікім шчасці,*
*Каб змагла праўнукаў*
*Шчыра даглядаці.*
*Хоць у жыцці сваім*
*Не мела яснай зоркі,*
*Але ўсё рабіла*
*Ты з вялікім толкам!*
*Ты сваіх суседзяў*
*Шчыра паважаеш,*
*За гэта падзякі*
*Вельмі многа маеш.*
*На твары заўсёды*
*У цябе ўсмешка*
*Калі ў каго нягоды,*
*Паможаш без рэшты.*
*Вось за гэта дзякуй*
*Мусім табе сказаці,*
*Каб табе жылося*
*Шчаслівей у хаце.*
*Каб больш ты не мела*
*Смутку ў сваім жыцці,*
*Таго Табе жадае*
*Сусед з панадворку.*



# ТАК БЫВАЛА

# Так было

*Так калісь бывала,*
*Як сказала маці:*
*„Ты, сынок, жаніся,*
*Мусіш Ганну браці.*
*Бо ў тае Ганны*
*Ёсць многа пасагу,*
*Дзесяціна поля*
*І грамафон ззаду”.*
*Тут бацька пацвердзіў,*
*Вяселле зрабілі,*
*Маладога хлопца*
*З Ганнай ажанілі.*
*Хоць Ганна старэйша*
*На гадоў дзесятак,*
*Хлопец быў дурнаваты*
*Ды Ганначку пасватаў.*
*А цяперка, гляньце:*
*Як яны пражываюць,*
*Кожны дзень сварацца*
*Без канца і краю.*
*Сынок бацьку кажа:*
*„Чаму табе верыў,*
*Нашто тая Ганна,*
*Каб цябе халера!*
*А з таею Ганнай*
*Ні да людзей, ні Бога,*
*Толькі ў маёй хаце*
*Кожны дзень трывога.*
*Праз тую трывогу*
*Не магу я жыці*
*Мушу развод браці*
*Другую палюбіці”.*

# Як у Бельску

Як у Бельску ў „штабе”
У войска прымаюць,
Пра бацькоў тых дзетак
Нічога не дбаюць:
Каб медаль ім даці
Ды нізка пакланіцца,
За тое, што сынкі іх
Сталі там трудзіцца!
Хоць гмінныя ўлады
Паперы ім даслалі,
То яны пра гэта
Нічуць не задбалі,
Бацькоў каб запрасіці,
Грахоўкі ім даці,
Ад шчырага сэрца
Ім падзяку скласці.
Быў я раз у гміне,
Там мяне пыталі,
Ці было прыемна,
Як медаль давалі!
Прызнаўся я шчыра,
Што аб тым не знаю,
Што ў „штаб” у Бельску
Мяне запрашалі!
І мне падказалі:
„Напішы ў „Ніву”,
Каб усе аб тым зналі.”
Я падумаў: праўда,
Так трэба зрабіці,
Можа, Бельскія ўлады
Не будуць мяне... судзіці?

# Міхалова

*Міхалова — гожае мястэчка,*
*Трэба вам аб гэтым знаць,*
*А за добрую работу*
*Войта трэба шанаваць.*

*Ёсць тут і касцёл з царквою*
*Што на ўзгорачках стаяць,*
*Людзі шчыра ў іх моляцца,*
*Каб Бога праслаўляць.*

*Па-суседску жывуць у згодзе*
*Праваслаўны і каталік:*
*Адзін аднаго клічуць у госці*
*Святкаваць за адзін столік.*

*Школу новую пабудавалі,*
*Яна як зорачка блішчыць.*
*Толькі чаму у новай школе*
*Беларуская мова не гучыць?*

*Можа райцы нам адкажуць,*
*Што ў гміне там сядзяць:*
*Ці бацькі, хоць беларусы,*
*Не хочуць роднай мовы знаць?*

*Ці іх гэта не абходзіць*
*Навучыць сваё дзіця?! —*
*Не цурацца роднай мовы,*
*Заўжды яе шанаваць?!*

*Можа Грэсь у сваёй газеце*
*Хоць раз аб гэтым успамяне —*
*Ён таксама ж беларус —*
*Ды сумленні ўскалыхне?*

*Потым хтосьці адгукнецца*
*Каб у „Ніве” абвясціць:*
*Што ўжо ў Міхалове*
*Беларуская мова зноў гучыць!*



# *Быў я ў „Марко”*

*Быў я ў Беластоку,*
*Не меў што рабіці,*
*Паехаў у „Марко”*
*Сабе штось купіці.*
*Калі там заехаў,*
*Мне ў галаве круцілась*
*Ад мноства тавараў*
*І абслугі мілай.*
*А калі пачаў я*
*Да цэнаў прыглядацца,*
*Тады пачало ў мяне*
*Ў галаве мяшацца.*
*Тут не трэба многа,*
*Каб рэкламу даваці.*
*Хочаш таней купіці*
*Трэба ў „Марко” быці.*

# Лясун

*Цяжка ўсё сядзець у хаце,*
*Пайду на двор і пахаджу*
*Ці шпацыркам пайду да лесу,*
*Свежым ветрам аддыхну.*
*Іду па лесе, моцна дыхаю,*
*Бачу: тут жоўты свежы пень,*
*Пры ім бы куча зялёная,*
*Ці то мох, ці можа звер?*
*Падыйшоў я да пня бліжэй,*
*Гляджу — гэта ж чалавек!*
*Руку пад голаў палажыўшы,*
*Спіць спакойна, бы навек.*
*Шкада мне стала, бо ж — жывы,*
*Яшчэ замерзне той нябога,*
*І для сям'і колькі бяды!*
*„Уставай, табе дамоў дарога,*
*Завесці мо цябе туды?”*
*Тут дзядзька чуць разварушыўся*
*Ды кінуўся вось так крычаць:*
*„Чаго ты тут так прычапіўся,*
*Я мушу злодзея чакаць!*
*Прыедзе ён тут на світанку*
*Вось гэту хвойку забіраць.*
*Мне паўлітэрку на пень ставіць,*
*І зноў пачнем мы балявацъ!”*
*І стаў я зноў яго прасіці:*
*„Ідзі дахаты, дарагі,*
*Бо твае вушы як у сіньцы,*
*І ўсё ўжо на табе дрыжыць.”*
*Лясун зноў горда адазваўся:*
*„Ідзі, адкуль прыйшоў сюды!*
*Ды да мяне ты не мяшайся,*
*Жонцы нічога не кажы!”*
*Дык павярнуў я крута ўлева*
*І рушыў проста, да сябе.*
*Ну, замярзай, каб це халера,*
*Як няма толку ў табе!*

# *Ой, хлопцы!*

*Ой, вы, мае хлопцы,*
*Каб на вас халера,*
*Ці цяпер не будзе*
*Мне ўжо кавалера?*
*Асталась я ў вёсцы,*
*Каб кароў даіці,*
*Мне цяпер прыйдзецца*
*Старой дзеўкай быці.*
*Быці старой дзеўкай,*
*Адной гараваці,*
*Калі паўміраюць*
*Мае бацька й маці.*
*Брат пайшоў у горад,*
*Там п’е і гуляе,*
*А пра гаспадарку*
*Нат не ўспамінае.*
*Часам брат прыедзе,*
*Каб наведаць вёску,*
*Захапіць у торбу*
*Сала ды каўбаску.*
*А як прыйдзе лета,*
*Пра нас забывае,*
*На дачы над морам*
*Ён адпачывае.*
*Адно ведаць трэба:*
*Як станем так рабіць*
*Тады будзе цяжка*
*У дзяржаве жыць.*



# Зарабіла

*Паехала Манька з хаты*
*Ў свет каб зарабіці.*
*Толькі асталіся дома*
*Яе муж і дзеці.*
*Цэлы год так Манька*
*Па свеце гуляла*
*Ды зялёныя даляры*
*Ў скарбонку хавала.*
*Як вярнулася Манька,*
*Пачаў муж пытаці:*
*— Раскажы, ці цяжка*
*Там грошы зарабляці.*
*— Ой, не вельмі цяжка,*
*Толькі трэба ўмеці*
*Як калі каму*
*Ты ўмееш паглядзеці.*
*А калі ўжо знойдзеш*
*Для сябе партнёра,*
*То трэба трымаці*
*З рана да вячора.*
*Што табе ён скажа,*
*Трэба так рабіці.*
*Нават часам голай*
*У гасцініцы свяціці.*
*Знай ты, даражэнькі,*
*Усе так зарабляюць,*
*Калі партнёр скажа,*
*То ў пасцель лягаюць!*

# Рэклама

*Перастань ты, дзядзька,*
*Ад каровы масла есці,*
*Бо ўсе хваробы*
*Стануць на це лезці.*
*Лепей еш ты „флякі”*
*З шалёнай каровы,*
*Будзеш ты, напэўна,*
*Увесь век здаровы.*
*Бо ў краях заходніх*
*Аб нас вельмі дбаюць,*
*Што ў іх папсавана,*
*Да нас выпіхаюць.*
*Маргарыну нову*
*„Бону” ці „Бульбону”*
*Спажывай, то будзеш*
*Здаравей ад слона.*
*Ды калі пачнеш ты*
*Маргарыну есці,*
*То тады не зможаш*
*Да жонкі падлезці!..*



# *Купіў*

*Купіў новую адзежу,*
*Каб прыгожа ўбрацца,*
*Ды паехаць у Белавежу*
*Там паразглядацца.*
*А калі прыбыў туды*
*У мазгах аж закруціла,*
*Пах пачуў я там такі*
*Пад акацыяй і пад івай.*
*У гасцініцах прыгожа —*
*Няма што казаці,*
*Ды на крайніх вуліцах*
*Можна ногі паламаці.*
*Каб пабачыць зуброў*
*Я брычку вазьму.*
*А яны там пражываюць*
*Як у гета ў вайну.*
*Агароджа там наўкол*
*Сторож з ружжом ходзіць,*
*Калі хоча зубр уцячы —*
*Ружжо да пляча прыложыць.*
*Трэба штосьці там зрабіць,*
*Даць зубрам больш волі,*
*Яны ж, бедныя,*
*Сядзяць у няволі!*

# *Кумпяк*

*Калісьці, бывала,*
*Як маці кумпяк пасоліць,*
*То ён праз паўгода*
*Ляжаў у „расолі”.*

*Ён і колер меў гожы,*
*І ў смаку быў добры,*
*Каштаваў яго кожны,*
*Бо ўсім быў даспадобы.*

*А цяпер як купіш*
*Тую шынку ў краме,*
*Хоць колер прыгожы,*
*Ды смаку не мае.*

*Туды розных хімікатаў*
*Вельмі многа пхаюць,*
*Каб вагу павысіць*
*Вады падбаўляюць.*

*Тэрмін для спажыцця*
*Два тыдні яна мае,*
*А рукой як сціснеш*
*Дык вада выцякае!*

*Усё мяса дарагое,*
*Усё цану павышаюць,*
*А вось сялянам на скупцы*
*Цану абніжаюць!*



# Чаму?

*Чаму дождж не ідзе,*
*Калі людзі просяць?*
*А ліе тады,*
*Калі сена косяць?*

*Я не магу на гэта*
*Нічога больш сказаці,*
*Гэта боская сіла —*
*Усім трэба знаці!*

*Нас пачатак лета*
*Дажджом сустракае,*
*Селянін сядзіць у хаце*
*На ўсё наракае.*

*Ён спакойна не можа*
*На гаспадарцы жыці,*
*Бо на ўсіх лежабокаў*
*Цяжка трэба рабіці.*

*За бясцэн прадукты*
*Ён мусіць прадаваці,*
*Каб зрабіць хоць трошкі*
*Парадак у сваёй хаце.*



# Наш Іванка

*У Іванкі ў агародзе*
*Ужо расцвіў чырвоны мак,*
*Усе хлопцы пажаніліс*
*А Іванка ходзіць сам.*
*Усе вёскі ён аб’ехаў,*
*Нідзе дзеўкі не знайшоў,*
*Кавалерам ён астаўся*
*Цяпер завуць яго батраком.*
*А чаму так называюць,*
*Я не магу таго сказаць.*
*Мне, старэчы, так сказалі,*
*Што батрак, то „халасцяк”.*
*Дзеўкі ў горад паўцякалі,*
*Каб там бруды падмятаць,*
*А на гаспадарцы Ваню*
*Жывёлу трэба даглядаць.*
*Іванка жывёлу даглядае,*
*Сам доіць ён кароў*
*Хаця грошай многа мае,*
*Яго дзеўкі лічаць за нішто.*
*Так вось Ванечку прыйдзецца*
*Век самому дажываць,*
*Бо бацькі, ужо старыя,*
*Хутка могуць паўміраць.*
*Каму гэта астанецца,*
*Калі Ваня пастарэ?*
*Ён жа дзетачак не мае,*
*Бо завецца „батраком”.*



# Гора

*Пайшло маё гора*
*У шыроку дарогу,*
*Цераз тое гора*
*Я маю трывогу.*
*Куды б я не ехаў —*
*Гора ўслед за мною.*
*Не магу яго пакінуць*
*І бяру з сабою.*
*Замкну сваё гора*
*Я ў роднай хаце,*
*Паеду за мора,*
*Шчасця пашукаці.*
*І там за вадою*
*Напаткаў я гора.*
*Яно яшчэ болей*
*Было мне ліхое.*
*Захацеў я гора*
*Куды-лень прадаці,*
*А яно ад учора —*
*У маёй роднай хаце!*
*Так жыву я з горам,*
*Увесь век страдаю.*
*Тая мая хата*
*Стаіць у вёсцы скраю.*



# *РОДНАЕ І РОДНЫЯ*



# Дубы

*На ўзгорку пры дарозе*
*Там стаялі два дубы.*
*Між сабою гаманілі,*
*Дзе сястрычку ім знайсці.*
*Кажа дуб сваёму брату:*
*„Глянь улева, падзівісь:*
*Там у даліне пры лужочку*
*Гай зялёненькі стаіць.*
*То сястрычкі там, бярозкі,*
*Між сабою так шумяць,*
*Вецер іх галлё калыша,*
*Аб чым кажуць — не чуваць.*
*Трэба нам ім пакланіцца,*
*Нізка галаву схіліць,*
*Паўслухацца, што гавораць*
*І з імі пагаманіць”.*
*А бярозкі ўсе, сястрычкі,*
*У свежым вецці ад вясны*
*Шчыра разам весяліліс,*
*Што зялёны гай яны.*
*А дубочкі, два браточкі,*
*Збоку там сабе стаяць,*
*Як дзве мілыя сіроткі*
*Між сабою гутараць.*
*Тут прахожы ішоў дарогай,*
*Сеў пад імі адпачыць*
*І аб чым шумяць паслухаць*
*Ды з імі пагаварыць.*
*А дубы яму сказалі:*
*„Ты, прахожы, не тужы,*
*З крыніцы папі вадзіцы*
*Ды далей сабе ідзі...”*



# Зямля

*Усе кажуць пра зямлю*
*Што яна — нам маці,*
*Але ў нас няма каму*
*Яе шанаваці.*
*Кожны цягне ўсё з зямлі*
*Яе забруджае*
*Але каб паратаваць,*
*Пра тое не дбае.*
*Едуць людзі на грыбы,*
*Скрозь смецце выкідаюць*
*Але штось ты ім скажы,*
*То цябе аблаюць.*
*Хоць ужо прыйшла зіма*
*І загнала сядзець у хаце,*
*Але пра зямельку родну*
*Мусім памятаці.*
*Шанаваць мы мусім лес*
*Ды даглядаць прыроду,*
*Калі хочам лепей жыць*
*І мець лепшу выгоду.*



# Зямелька-маці

*Шумяць вербы каля грэблі,*
*Вясну абвяшчаюць,*
*Кветкі ў лесе зацвілі,*
*Пайшоў дождж у маі.*

*Ураджайны будзе год,*
*Усе будзем шчаслівы,*
*Бабка і дзед з унукамі*
*Жыці будуць міла!*

*Дзедка ўнукаў навучае*
*Зямлю-маці шанаваць,*
*Яе песціць трэба так,*
*Як песціла вас маці.*

*Нам жыццё даюць зямля*
*Ды чыстае паветра,*
*Сонейка нас агравае,*
*Каб жыць было лепей.*

*Шануйце, унукі,*
*Нашу зямельку-маці*
*Ды вучыце сваіх дзетак*
*Яе шанаваці!*

# *Студзень*

*Як, здаецца, прыемна,*
*Калі сядзіш у хаце,*
*І так праз вакенца*
*На свет пазіраці.*
*Як зямля прыкрыта*
*Снежным мяккім пухам,*
*А дрэўцы калыша*
*Ў садзе завіруха.*
*Як загляне ў комін,*
*Загудзе сярдзіта,*
*Як за сну праснешся,*
*На дварэ так ліха.*
*Ужо па полі гуляе*
*Туман белага пылу,*
*Зраўняў усе дарогі,*
*Не праедзеш машынай.*
*Прыляціць снягір пад хату,*
*Застукае ў акенца,*
*Просіць даць яму есці,*
*Забаліць твае сэрца.*
*Сінічка ў акенца*
*Шчыра так заглядае,*
*І ёй даць есці трэба,*
*Бо ж зіма лютая.*
*А сарока як злодзей*
*Па двары гуляе,*
*Каб дзе яйка ўкрасці*
*Пільна ўсё шукае.*
*Пра варону няма мне*
*Што ўжо і казаці.*
*Закрычыць там на дрэве,*
*Мароз мусіць уцякаці!*
*І так студзень мінае,*
*Дня ўсё прыбывае*
*І зіма памаленьку*
*Ад нас адступае.*

# *Сакавіцкія жарты*

*Сакавік такі месяц,*
*Аб тым кожны знае:*
*Ён зіму з летам*
*У нас пераплятае.*
*Часам сонца грэе*
*І цёпла бывае,*
*Часам так марозіць,*
*Ёсць зіма ліхая.*
*У сакавіку нам трэба*
*Да ўсяго рыхтавацца:*
*Часам авёс ужо сеяць,*
*Ці ў валёнкі абувацца.*
*(У нас цяпер прырода*
*Усё перамяніла,*
*І нават красавік*
*У зімуператварыла!)*
*І ёсць такое свята,*
*Пра што добра знаем,*
*Што хоць маленькую кветку*
*Для жанчын купляем.*
*Пад канец таксама*
40 *мучанікаў бывае,*
*Але нашы жанчыны*
*Пра тое забываюць...*
*Кабетам здаецца,*
*Што мусіць так быць,*
*Што кожны мужчына*
*Мусіць кветку купіць.*
*А калі мужчына*
*Сваё свята святкуе,*
*Ён тады дахаты*
*П’яны прывандруе.*



# Сакавік

*Сакавік то месяц,*
*У якім усё бывае:*
*Ён зіму з вясною*
*Ўсё пераплятае.*
*Трэба тое людзям*
*Усім добра знаць:*
*З сакавіком ніколі*
*Нельга жартаваць!*
*Часам снегу сыпне*
*Больш як за калені,*
*І з хаты не выйдзеш,*
*Такая завея.*
*Часам так лагодна*
*Сонца прыгравае,*
*Што табе здаецца,*
*Цёпла, як у маі.*
*Часам так ён блудзіць*
*Ды ўсё застудзіць,*
*Мёрзнуць звяры, птушкі,*
*Замярзаюць людзі.*
*Сакавік фіглюе,*
*Жартаў не шкадуе.*
*А ўсё трэба знаць*
*І з ім сябраваць.*



# Красавік

*Людзі кажуць, красавік*
*Гэта месяц мілы.*
*Расквітаюць кветкі ў ім*
*І кожны шчаслівы.*
*Сонейка ўгару пайшло,*
*Лепей стала грэці,*
*Людзей у поле павяло,*
*Каб зямлю рабіці.*
*З усім і я ажыў сам,*
*Выйшаў на дарогу.*
*За ўсё дзякаваць трэ нам*
*Шчыра Пану Богу:*
*За ўсе Божы ласкі,*
*Што нам даў здароўе,*
*Каб усе маглі мы*
*Ў свеце жыць спакойна.*
*За Яго турботы,*
*Што нам адымае*
*І грахі, дурноты*
*Што нам адпускае.*

# *Лістапад*

*Лістапад — то сумны месяц,*
*Восень ужо ідзе на спад.*
*Агольваюцца дрэвы ў лесе,*
*Пусташэюць луг і сад.*
*Цяжкая праца прыходзіць*
*І для птушак і звяроў.*
*Селяніну прыдбаць трэба*
*Пашу для сваіх кароў.*
*Ужо ў парках і на скверах*
*Лісце трэба прыбіраць,*
*А кветкі прыкрыць шчыльна,*
*Каб добра іх празімаваць.*
*Боты цёплыя купіць трэба,*
*Каб не мерзнуць нам зімой.*
*Шубу-футра сабе справіць,*
*Каб не страшны быў мароз.*
*Загатовіць дроў на зіму,*
*Каб хату добра абагрэць*
*Ды свае старыя косці*
*На ляжайцы разагрэць.*
*Тады нам не будуць страшны*
*Ані сцюжы, ні мароз,*
*Толькі будзем упіраць*
*У тэлеэкран уласны нос.*



# Восень

*Палі ўжо пусцеюць,*
*Жаўцее трава,*
*Няўхільная восень*
*У вёску прыйшла.*
*Усё замірае*
*Па садах, лугах.*
*Селянін, спяшайся*
*Зямлю заараць,*
*Каб збожжа пасеяць*
*Ды бульбу сабраць.*
*Старайся жа моцна,*
*Каб дроў ты прывёз.*
*Не будзе нам страшны*
*Ні снег, ні мароз.*
*Бо мы — працавіты*
*Вясковы народ,*
*І горда стрымаем*
*І сцюжы, і дождж.*



# Асцярожна з прыродай

*Братцы, з прыродай асцярожна,*
*Бо можа здарыцца рознае.*
*Яна наш дом дасканалы —*
*Варт пашаны і найлепшай славы.*
*Мы прыроду псуем, забруджваем,*
*Пасля невядома каго праклінаем.*
*Калі кіслотны дождж упадзе,*
*Наша праца на полі прападзе.*
*Марнуем лес, як на паляну —*
*Ад гэтага на зямлі будуць раны.*
*Смурод пускаем у рэчкі*
*І сядзім ля гарачае печкі.*
*Бесталкова валім штучнае ўгнаенне...*
*І як можа быць з прыродай прымірэнне?*
*Навокал адна звалка, балаган —*
*Вылечыцца нам ад гэтых ран!*



# Парадак

*Лес, прырода — усяго згода,*
*Трэба нам іх шанаваць.*
*Бор паветра ачышчае*
*І аб гэтым трэба знаць.*
*Калі едзеш на пікнік,*
*Не забуць асноўнае:*
*Па сабе прыбраць усё*
*Да чысціні поўнае,*
*І лясоў не забруджаць,*
*Ні азёраў, ані рэк,*
*Тады з прыемнасцю скажу,*
*Што ты сумленны чалавек.*
*Калі будзеш гультаём*
*Ды сам не папрачаш,*
*Знай тады, браточак мой,*
*Жыццё будзеш мець сабачае.*

# *Трэба шанаваць*

*Нашаю зямелькай*
*Трэба даражыці*
*І зімой, і летам*
*Яе шанаваці.*
*Бо наша зямелька,*
*Як у садзе кветка,*
*Для нас дарагая*
*І зімой, і летам.*
*Аб нашай зямельцы*
*Трэба ўсім казаці*
*І ў кожную пару года*
*Яе шанаваці.*
*Каб нам не забыцца*
*Пра нашу зямельку,*
*Яе любіць заўсёды.*
*І зімой і ўлетку.*
*З ёю я абжыўся*
*Як з роднаю маці,*
*Ды зімой і ўлетку*
*Буду яе шанаваці*
*І буду прасіці*
*У Госпада Бога,*
*Каб наша зямелька*
*Усім дала выгоду.*
*Каб мы весяліліcь*
*Ды маліліcь Богу*
*За нашу зямельку*
*І наша здароўе.*

# Бура

*Пракацілася бура*
*Над Малой айчынай,*
*Усе людзі бачаць,*
*Што яна зрабіла:*

*Дрэвы як запалкі*
*На зямельку клала,*
*Чарапіцу з дахаў*
*Бы пер’е скідала.*

*На адну хвіліну*
*Удзень пацямнела,*
*Толькі круціў вецер*
*Ды бура шалела.*

*Можа мы, людкове,*
*У Бога ніц нявартыя,*
*Што ў нас буры*
*Такія ўпартыя?*

*Ці ж нашыя людзі*
*Так многа саграшылі*
*Што віхры ды буры*
*Нам шкоды нарабілі?*

*Трэба нам маліцца,*
*Прасіць шчыра ў Бога,*
*Каб ён нас направіў*
*На добрую дарогу.*



# Грышу Марозу

*Дзякуй табе, Грыша,*
*Што ты адазваўся,*
*На старонках „Нівы”*
*Ізноў паказаўся.*
*Твае словы шчыры*
*Міла я чытаю*
*Ды табе з сям’ёю*
*Я шчасця жадаю.*
*Ты жыві багата,*
*Жыццём весяліся,*
*Не забудзь пра „Ніву”,*
*Часцей пакажыся.*
*Хай цябе чытаюць*
*Вакол Беразова, —*
*Таго табе жадае*
*Твой прыяцель Коля.*



# Сакрату Яновічу

*З нагоды юбілею*
*Шчасця я табе жадаю!*
*Сто гадоў каб ты пражыў*
*Ды заўжды здаровы быў,*
*Родну мову пашыраў,*
*Свае кніжкі выдаваў*
*Ды каб Крынкі весяліў*
*І пра нас каб не забыў.*

*Ад усіх нас, што чытаюць*
*І стараюцца пісаць:*
*Плённай працы мы жадаем,*
*Каб культуру расслаўляць!*



# Пронар

*Калі ў цябе сучасны густ,*
*Ты на „Урсус” не зважай.*
*Калі хочаш купіць трактар,*
*У Нарву ў Пронар прыязджай.*
*Тут усё табе падкажуць*
*І да праўды давядуць.*
*„Уладзімірац” — калі ласка,*
*Ды і „МТЗ” табе прададуць.*
*Пронар славіцца навокал,*
*Кожны яго знае,*
*Бо па ўсёй нашай краіне,*
*Трактары рассылае.*
*Фірме Пронар шчыры дзякуй,*
*Што ствараюць дабрабыт,*
*Тэхніку нам пастаўляюць,*
*Каб шчасліва мы жылі.*
*Мартынюк і Чарнякевіч,*
*Да таго ж Амельянюк —*
*Шчасця я для вас жадаю,*
*Сто гадоў каб вы жылі!*



# *Ці трэба...*

*Ці ў Ласінцы трэба*
*Школу будаваці,*
*Калі ў Нарве будзе*
*Школа пуставаці?*
*Тут на „сцяне ўсходняй”*
*Ўсе вёскі паміраюць,*
*Яны ж перспектывы*
*Ніякае не маюць.*
*Пайшлі дзеці ў горад,*
*І там пажываюць.*
*Пра бацькоў загоны*
*Ніц не ўспамінаюць,*
*Каб зямлёй заняцца,*
*Сеяць ды ўбіраці,*
*Бо на гаспадарцы*
*Цяжка працаваці.*
*І ў Нарве трэба будзе*
*Школу адмяніці,*
*На дом пенсіянера*
*Яе перахрысціці.*
*То Плева задумаў*
*Школу будаваці,*
*Нашым людзям сілу*
*Сваю паказаці?*
*Бо пасол з лявіцы*
*Пра нас добра дбае,*
*Але ці здаровага*
*Розуму хапае?*
*Бо ж вёскі пусцеюць,*
*А бацькі ўміраюць,*
*А нашыя дзеткі*
*Ў гарадах гуляюць!..*



# *Пажаданні*

*Пажаданні ў Новым годзе,*
*Дарагія, усім вам шлю,*
*Каб усе жылі шчасліва,*
*Бераглі нашу зямлю.*
*Каб весела ўсім вялося,*
*Гора і бяды не спазналі,*
*А нашу бацькаўшчыну родну*
*Усе шанавалі.*
*Каб былі ўсе здаровы*
*Дзеткі, унукі і дзяды.*
*Каб ніколі не хварэлі*
*І да лекара не йшлі.*
*Каб жыццём усе радаваліся,*
*Радасць мелі і рублі,*
*Пажаданні вам пасылаю*
*Я ад шчырае душы.*



# *Каб былі здаровы*

*Каб усе былі здаровы,*
*Не пакіньце роднай мовы.*
*Трэ свой мовай ганарыцца*
*І ніколі не забыцца.*
*Куды б ехаў, дзе б не быў,*
*Каб роднай мовы не забыў!*
*Сваю мову трэба знаць,*
*І ёй дзетак навучаць.*
*Не забудзь пра родну мову*
*(Тады будзеш і ты здаровы),*
*Каб ніколі не прапала*
*І ў пашане панавала.*
*Тым, што пішуць і чытаюць,*
*Шчасця і долі ўсім жадаю.*

# Змест


МАЕ ДУМКІ, МАЯ ВЕРА

Да беларусаў! ... 5
Крэда ... 6
Мая вера ... 7
Беларусь ... 8
Думаў ... 9
Дзеткі ... 10
Адзін ... 11
Не забылі ... 12
Беларусы ... 13

БАЛІЦЬ СЭРЦА

„Земляроб” ... 15
Куранёўка ... 16
Як далей ... 17
Ігнатка ... 18
Трэба дзякаваць ... 19
На вёсцы ... 20
Не спадзяваўся ... 21
Уладзіміру ... 22
Самаўрад ... 23
Усходняя сцяна ... 24
Жніво ... 25
Кепская нявестка ... 26
Суседка ... 27
Турботы ... 28
Парада на доўгае жыццё ... 29
Навагоднія пажаданні ... 30
Шлюбныя пажаданні ... 31
Унукам ... 32
Залаты юбілей ... 33
Нарадзіла ... 34
Кожны пхнецца ... 35
Рута ... 36

ТАК БЫВАЛА


Так было........................................ 38
Як у Бельску.................................. 39
Міхалова........................................ 40
Быў я ў „Марко”............................ 41
Лясун.............................................. 42
Ой, хлопцы!................................... 43
Зарабіла......................................... 44
Рэклама.......................................... 45
Купіў.............................................. 46
Кумпяк........................................... 47
Чаму?............................................. 48
Наш Іванка.................................... 49
Гора............................................... 50


РОДНАЕ І РОДНЫЯ


Дубы............................................... 52
Зямля............................................. 53
Зямелька-маці............................... 54
Студзень........................................ 55
Сакавіцкія жарты........................ 56
Сакавік....................................... 57
Красавік........................................ 58
Лістапад........................................ 59
Восень............................................ 60
Асцярожна з прыродай................. 61
Парадак......................................... 62
Трэба шанаваць........................... 63
Бура............................................... 64
Грышу Марозу............................... 65
Сакрату Яновічу........................... 66
Пронар........................................... 67
Ці трэба......................................... 68
Пажаданні..................................... 69
Каб былі здаровы......................... 70